# Першая сусветная вайна – урок гісторыі сусветнага маштабу

**І. М. Шымко,**
настаўнік гісторыі
вышэйшай катэгорыі
Глыбоцкай раённай гімназіі

У апошні час усё больш увагі надаецца падзеям Першай сусветнай вайны Гісторыкі бачаць вялікі патэнцыял у вывучэнні Першай сусветнай вайны, як падзеі, якая стала пачаткам цяжкага часу, змяніла ўяўленні пра цывілізацыю, тэхнічныя дасягненні. Першая сусветная вайна – апакаліпсіс сусветнага маштабу. На ўроку вучні павінны паспрабаваць асэнсаваць маштабы вайны з палітычнага, эканамічнага і псіхалагічнага аспектаў, звязаць з краязнаўчым матэрыялам. У якасці дамашняга задання прапануецца стварыць міні-праект даследчага характару.
На уроку выкарыстаны элементы актыўнай ацэнкі пры пастаноўцы мэты урока, вызначэння крытэрыяў дасягнення мэты, пры выкананні дамашняга задання. Медыяадукацыйны патэнцыя урока складае работа з медыятэкстамі (відэа (https://www.youtube.com/watch?v=q06rslOnW7s), фота, ваенныя лістоўкі), што дазваляе стварыць праблемныя сітуацыі.

**Тэма. Прычыны вайны і ход ваенных дзеянняў у 1914–1916 гг.**
9 клас

**Мэты ўрока для настаўніка:**
1) раскрыць сутнасць міжнародных адносін напярэдадні Першай сусветнай вайны;
2) пашырыць веды вучняў аб новых спосабах вядзення вайны, раскрыць сутнасць паняцця “псіхалагічная вайна”;
3) даць характарыстыку асноўным бітвам 1914–1916 гг. і дапамагчы ўсвядоміць бессэнсоўнасць вялікіх страт у вайне;
4) працягваць работу па фарміраванні негатыўных адносін да вайны, развіцці навыкаў работы з картай і медыятэкстамі (фота, відэа, лістоўка), уменняў характарызаваць гістарычныя падзеі, аналізаваць гістарычныя факты і рабіць высновы.

**Мэта на мове вучняў:** даведаюся, чаму пачалася Першая сусветная вайна, як складваліся адносіны паміж еўрапейскімі дзяржавамі Англіяй, Францыяй, Германіяй напярэдадні вайны, аб асноўных бітвах 1914–1916 гг. і іх выніках.

**НАШТОБУЗУ**:
1. Ведаю, калі пачалася Першая сусветная вайна, асноўную прычыну вайны.

2. Назаву асноўныя кірункі палітыкі Англіі, Германіі, Францыі напярэдадні вайны.
3. Адкажу на пытанне, што такое “гонка ўзбраенняў”, “псіхалагічная вайна”.
4. Назаву і пакажу на карце два ваенна-палітычныя блокі.
5. Назаву і пакажу на карце тры асноўныя бітвы 1914–1916 гг.
6. Выкажу меркаванне наконт метадаў вядзення вайны краінамі-ўдзельніцамі.

**Забеспячэнне ўрока**: выказванні аб вайне, тэст для самаправеркі, рэпрадукцыя В.В. Верашчагіна “Апафеоз вайны”, фотаздымкі бітвы пад Вердэнам, ключавыя пытанні, дакументальны фільм “Імгненні XX ст. 1916 г. Бітва пад Вердэнам (https://www.youtube.com/watch?v=q06rslOnW7s), выявы ваенных лістовак http://psywarrior.com/WWIAllies.html

**Ход урока**

I. **Арганізацыйны этап**

II. **Мэтавызначэнне**

Настаўнік называе тэму ўрока і прапануе вучням выказацца, аб чым ім хацелася б даведацца пры вывучэнні дадзенай тэмы. Заслухаўшы варыянты адказаў, настаўнік разам з вучнямі вызначае мэты ўрока. Затым настаўнік раздае “наштобузу”, якія надрукаваны на лістках, прапануе абмеркаваць іх у парах.

**Ключавыя пытанні:**

1. Хто вінаваты?

2. Ці можна было пазбегнуць Першай сусветнай вайны?

**III. Вывучэнне новага матэрыялу**

***Уступнае слова настаўніка***: Першая сусветная вайна – адна з найбуйнейшых у гісторыі чалавецтва войнаў – цягнулася з 1 жніўня 1914 па 11 лістапада 1918 гг. Усяго ў вайне ўдзельнічалі 33 дзяржавы. Два магутныя ваенна-палітычныя блокі супрацьстаялі адзін аднаму – Антанта і Траісты саюз (*настаўнік паказвае на карце).* На палях бітваў ваявала каля 70 млн чалавек.

***Пытанне да вучняў:***

***Калі б у вас была магчымасць паставіць помнік вайне, то якім бы ён быў?***

*(Заслухаўшы некаторыя версіі дзяцей, прапануецца рэпрадукцыя карціны В. Верашчагіна “Апафеоз вайны” – своеасаблівы помнік вайне. Аўтар не ставіць мэтай напалохаць гледача, а звяртаецца да нашчадкаў з маленнем спыніць войны. На раме карціны мастак пакінуў надпіс:* ***“Прысвячаецца заваёўнікам: сучасным, мінулым і будучым”.***

***Аналіз*** **карціны В. Верашчагіна “Апафеоз вайны”**

1. Дайце сваю назву карціне.
2. Які настрой выклікае карціна? Што асабліва ўражвае на карціне?

3. Якімі мастацкімі сродкамі аўтар выражае асноўную ідэю карціны (колер, прырода, аб'екты карціны і г.д.)?
4. Як вы разумееце сэнс надпісу, які аўтар пакінуй на карціне?

(дадатак 1)

***Слова настаўніка:*** Васіль Верашчагін – першы мастак, які паказаў вайну не як пераможнае шэсце, узнагароды і славу, а адлюстраваў сапраўдны вобраз вайны, дзе пануе чалавечы боль і няшчасце. Нездарма ў 30-я гады XX ст. у Германіі была забаронена выстава карцін В. Верашчагіна. "Перада мною як перад мастаком вайна і я ЯЕ б'ю, колькі ёсць у мяне сілы", – так сказаў пра свае карціны мастак. (*Настаўнік звяртае ўвагу на выказванні пра вайну для замацавання маральнага ўздзеяння на навучэнцаў.)*

Селянін апрацоўвае палі, рабочы абагачае гарады, мысліцель думае, прамысловасць стварае цудоўныя рэчы, геній творыць цуды… і ўсё гэта гіне на жахлівай міжнароднай выставе, якая завецца полем бітвы.

*Віктор Гюго*

Або чалавецтва пакончыць з вайною, або вайна з чалавецтвам.

*Джон Кенэдзі*

Улічваючы цяжкае становішча многіх краін, уступіўшых ў вайну, заклікі да міру сталі гучаць падчас Першай сусветнай вайны. Аднак было шмат прыхільнікаў вайны – буйных манапалістаў, палітыкаў, ваенных, якія не адмаўлялі вядзенне вайны да пераможнага канца.

У канцы ўрока або на наступным уроку мы адкажам на пытанні:

**Хто вінаваты? Ці магчыма было пазбегнуць Першай сусветнай вайны?**

*(У выніку рашэння лагічнай задачы настаўнік разам з навучэнцамі вызначае прычыну Першай сусветнай вайны.)*

Задача. Чаму менавіта ў эпоху імперыялізму пачалася Першая сусветная вайна?

**Імперыялізм – ?– ?– ?– ?– ВАЙНА** (развіццё прамысловасці, павелічэнне колькасці прадукцыі (тавара), рост патрэбнасці у рынках збыту і крыніцах сыравіны, саперніцтва з-за чужых тэрыторый і, як вынік, – вайна)

**Прычына вайны** – саперніцтва з-за чужых тэрыторый і рынкаў збыту *(запіс у сшытку).*

**Пытанні:**

1. Як вы думаеце, якая краіна ў першую чаргу магла цікавіцца рынкамі збыту і чаму? (Неабходна падвесці вучняў да разумення, што гэта Германія.)
2. Калі ўтварылася Германская імперыя ? (1871 г.)
3. Чаму ў сярэдзіне 1880-х гадоў Германія актыўна ўключаецца ў барацьбу за калоніі? (*Вельмі хуткія тэмпы развіцця і імкненне атрымаць калоніі, якіх Германія не мела.*)

Германская імперыя, утвораная пасля франка-прускай вайны 1870 года, першапачаткова не імкнулася да палітычнага і эканамічнага ўплыву ў Еўропе. Аднак, нягледзячы на тое, што яе стваральнік Бісмарк заявіў, што пакуль ён займае пост канцлера, Германія не будзе мець калоній, умацаваўшыся ў эканамічным і палітычным сэнсе краіна, да сярэдзіны 1880-х гадоў уключылася ў барацьбу за калоніі. Германія спяшалася заняць спрэчныя і не трапўшыя ў каланіяльную залежнасць рэгіёны, а таксама стварала пагрозу каланіяльным уладанням Англіі, Францыі, Бельгіі, Нідэрландаў і Партугаліі. Пры гэтым Германія пачала пагражаць існаванню буйнейшых каланіяльных імперый: Вялікабрытаніі, Францыі, якія былі вымушаны аб’яднацца ў” Сардэчнай згодзе”- Антанце.

**Работа ў парах з тэкстам падручніка**

**Заданне**. Вызначыць асноўныя кірункі палітыкі Англіі, Францыі, Германіі напярэдадні вайны (5–6 хвілін).

Пры адказе на дадзенае пытанне выкарыстоўваецца прынцып неўздымання рукі. Пасля выканання дадзенага задання вучні называюць два ваенна-палітычныя блокі – Траісты саюз і Антанта і асноўныя кірункі палітыкі. (*Настаўнік паказвае на карце ваенна-палітычныя блокі і краіны, якія ў іх уваходзілі.)*

Для вывучэння паняцця “гонка ўзбраенняў” было дадзена індывідуальнае дамашняе заданне вучню, і на ўроку ён коратка расказвае, што гэта такое. (*Акцэнт неабходна зрабіць на тое, што было вынайдзена шмат зброі, упершыню была прыменена зброя масавага паражэння – газ іпрыт.)*

**Гонка ўзбраенняў** – павелічэнне ваеннай моцы, распрацоўка новай зброі (*запіс у сшытку).*

Маральны аспект пытання: фарміруецца думка, што дасягненні навукі могуць не толькі палепшыць жыццё людзей, але і садзейнічаць стварэнню зброі масавага знішчэння. Сведкамі такіх маштабных разбурэнняў чалавечага лёсу служаць фатаграфіі з выявамі вынікаў бітв (дадатак 2).

**Работа настаўніка і вучняў з тэкстам падручніка.**

На падставе матэрыялу падручніка састаўляецца кароткая схема ўступлення дзяржаў у вайну. Настаўнік паказвае дзяржавы на карце, вучні працуюць з атласамі.

**Работа ў парах (пункт 4, атласы)**

Заданне. Запоўніць табліцу “Асноўныя бітвы 1914–1916 гг.”

| Дата | Асноўныя бітвы (тры) | Іх вынікі |
|---|---|---|
| | | |

Пасля выканання задання навучэнцы называюць і паказваюць на карце тры асноўныя бітвы 1914–1916 гг. *(выкарыстоўваецца прынцып неўздымання рукі)*

## Работа з медыятэкстамі

**Мэта:** развіваць уменні працаваць з інфармацыяй, аналізаваць, вызначаць асноўны пасыл медыятэкстаў.

**І. Дакументальны фільм** "Імгненні ХХ ст. 1916 г. Бітва пад Вердэнам"

**Мэта:** усвядоміць бессэнсоўнасць вядзення вайны з пазіцыі чалавечнасці.

У якасці дамашняга задання вучням было прапанавана прагледзець дакументальны фільм "Імгненні ХХ ст. 1916 г. Бітва пад Вердэнам (https://www.youtube.com/watch?v=q06rslOnW7s) і занатаваць найбольш яркія выказванііі аб вайне, якія прагучалі ў фільме.

Пытанні:

1. Як паказаны адносіны да вайны Францыі і Германіі ў пачатку ваенных дзеянняў?
2. Як выказваюцца аб ваенных дзеяннях іх сведкі?
3. Як называюць бітву пад Вердэнам? Чаму?
4. Якія эпітэты найбольш вас уразілі?
5. Які асноўны пасыл даннага медыятэксту?
6. Ці можна давяраць дадзенаму матэрыялу? Чаму?

(Настаўнік звяртае ўвагу на фота Вердэнскай мясарубкі, якое супадае з кадрамі фільма аб бітве пад Вердэнам і выказваннямі сведкаў).

**Аналіз ваенных лістовак**

**Мэта:** даказаць, што СМІ фарміруюць грамадзянскую пазіцыю, могуць служыць псіхалагічнай зброяй пры вядзенні ваенных дзеянняў.

**Слова настаўніка.** Тактыка псіхалагічных аперацый прымянялася яшчэ Аляксандрам Македонскім, Чынхісханам і іншымі палкаводцамі. Аднак большасць даследчыкаў лічыць, што сучасныя псіхалагічныя аперацыі пачалі праводзіцца падчас Першай сусветнай вайны. Гэтаму спрыяла наяўнасць СМІ, радыё, добра прадуманых сродкаў данясення інфармацыі да мэтавай аўдыторыі. Сярод новых сродкаў распаўсюджвання інфармацыі былі самалёты, спецыяльныя артылерыйскія снарады, прапагандысцкія мінамётныя міны, паветраныя шары.

У 1914 годзе Брытанія мела адны з лепшых СМІ, вялікі вопыт міжнароднай камунікацыі ў тэхналагічных і камерцыйных мэтах. Брытанцы хутка ўзялі ініцыятыву па фарміраванні грамадскай думкі. Яны заверылі свет у тым, што распаўсюджваюць праўду, а інфармацыя ад Германіі – гэта падман. Адным з відаў прапаганды супраць Германіі былі лістоўкі. Мэта – падарваць баявы дух нямецкіх салдат

(*Настаўнік прапаноўвае папрацаваць з лістоўкамі часоў Першай сусветнай вайны. Для эканоміі часу можна клас разбіць на групы і кожнай групе прапанаваць прааналізаваць змест адной з лістовак згодна з памяткай.*

<table>
<tr>
<td>
</td>
<td>
</td>
</tr>
<tr>
<td>Вы забралі ў мяне дзяцей: Іосіфа няма, і Сімеона няма, і Веніяміна забраць хочаце<br>(На лістоўцы адлюстравана нямецкая маці, якая пасылае свайго сына на вайну. На сцяне фатаграфіі ў чорнай рамцы, якія “гавораць” аб тым, што яго бацька і браты ўжо загінулі. Назва лістоўкі “Апошні”.)</td>
<td>Назва лістоўкі “Няўдзячнасць”. Нямецкі салдат глядзіць на добра апранутых багатых грамадзян на вечарыне.</td>
</tr>
<tr>
<td>
</td>
<td>
</td>
</tr>
<tr>
<td>Назва “ Месца пад сонцам”. Подпіс: Вашы правіцелі патрабуюць месца пад сонцам, але дзе будзе ваша месца?</td>
<td>Ты патрэбен Брытаніі!</td>
</tr>
</table>

## Памятка:

1. Што вы бачыце на лістоўцы? Што на першым плане, што на другім? Як вы думаеце, чаму?
2. Расшыфруйце надпісы пад лістоўкамі.
3. Для якой мэтавай аўдыторыі створаны лістоўкі?
4. Які пасыл дадзеных лістовак?
*(Вучні вызначаюць ролю псіхалагічнай зброі падчас вядзення ваенных дзеянняў.*

**IV. Самаправерка ведаў** *(вучням раздаюцца карткі з пытаннямі, на якія вучні адказваюць пісьмова):*
1. Назавіце храналагічныя рамкі Першай сусветнай вайны.
2.Асноўная прычына Першай сусветнай вайны…
3.Назавіце два ваенна-палітычныя блокі.
4.Назавіце тры асноўныя бітвы і іх вынікі.
5. Гонка ўзбраенняў- гэта…
**Работа з картай на замацаванне:**
1. Пакажыце Антанту і Траісты саюз.
2. Пакажыце горад, у якім адбылося забойства наследніка аўстра-венгерскага прастола.
3. Пакажыце бітву на р. Марна, бітву ў раёне г. Вердэна, “Брусілаўскі прарыў”.
*(Тут таксама можна скарыстаць прынцып “неўздымання рукі”)*

**V. Рэфлексія**
1. Якія гістарычныя факты асабліва ўразілі? Чаму?
2. Работа з якім медыятэкстам (відэа, фота, лістоўка) была найбольш цікавай? Чаму?

**Дамашняе заданне:** параграф 30.
**Наштобузу да дамашняга задання**
1. Ведаць храналагічныя рамкі і прычыну Першай сусветнай вайны.
2. Ведаць асноўныя кірункі палітыкі Германіі, Англіі, Францыі напярэдадні вайны.
3. Ведаць, якія ваенна-палітычныя блокі ўтварыліся і чаму.
4. Называць асноўныя бітвы і іх вынікі.
5. Ведаць, што такое “гонка ўзбраенняў”.
*** Паразважаць над пытаннямі “Хто вінаваты ў вайне ?” і “Ці магчыма было пазбегнуць Першай сусветнай вайны?”, падрыхтаваць дадатковую інфармацыю аб глыбачанах – удзельніках Першай сусветнай вайны.

**Дадатак 1**

## Гісторыя стварэння і апісанне карціны В.В. Верашчагіна "Апафеоз вайны"

Карціна была напісана ў 1871 годзе. Ідэя сюжэта была звязана з Тамерланам, войска якога пакідалі за сабой такія пірамміды чарапоў.

Па другой версіі, карціна была створана пад ўражаннем расказа аб тым, як правіцель Кашгара Валіхан пакараў еўрапейскага падарожніка і даў загад пакласці яго галаву на вяршыню піраміды, складзенай з чарапоў другіх пакараных людзей.

Падчас ваеннай службы ў Туркестане Верашчагін нагледзеўся на смерць і трупы, што выклікала ў яго пратэст. А пасля паездкі ў Западны Кітай, дзе жорстка пакаралі паўстанне супраць улад, з'явілася карціна "Апафеоз вайны".

"Апафеоз вайны" – адзін з самых яркіх твораў Верашчагіна. На карціне паказана піраміда з чалавечых чарапоў на фоне разбуранага горада і спаленых дрэў, сярод стэпу. Вакол піраміды – вораны. Усе дэталі карціны, у тым ліку жоўты колер, сімвалізуюць смерць і спусташэнні. Яснае неба падкрэслівае мертвы пейзаж карціны. Ідэю "Апафеоза вайны" ярка выражаюць сляды ўдараў зброі на чарапах загінуўшых.

Вядомы рускі мастацкі крытык Уладзімір Васільевіч Стасаў пісаў аб "Апафеозе вайны":

"Здесь дело не только в том, с каким именно мастерством Верещагин написал своими кистями сухую пожжённую степь и среди неё пирамиду черепов, с порхающими кругом воронами, отыскивающими ещё уцелевший, может быть, кусочек мясца. Нет! Тут явилось в картине нечто более драгоценное и более высокое, нежели необычайная верещагинская виртуальность красок: это глубокое чувство историка и судьи человечества".

**Карціна В.В. Верашчагіна "Апафеоз вайны"**



**Дадатак 2**




**“Вердэнская мясарубка” (“Мясарубка д’ябла”)**



**Вынікі “Вердэнскай мясарубкі”**



**Фотаздымак “Вердэнская мясарубка”**

**Краткое описание битвы под Верденом**

К началу 1916 года германское командование приняло свой новый план по разгрому армий союзников на Западном фронте, основная суть плана немцев состояла в том, чтобы прорвать так называемую верденскую дугу - оплот всего французского фронта, чтобы тем самым вызвать существенное стратегическое изменение в расстановке сил на всем Западном фронте и, выйдя непосредственно к Парижу, принудить руководство Франции к капитуляции.

Активные боевые действия под Верденом начались 21 февраля 1916 года, именно в этот день германская армия начала свое самое кровопролитное сражение из всех сражений, в которых участвовала Германия за всю историю своего существования, 946 орудий, из которых почти 500 тяжелых, открыли массированный огонь по французским позициям, участок, предназначенный для прорыва фронта составлял всего-то не более 12 километров, десять часов, без остановки и перерывов, германцы долбили своей тяжелой артиллерией. Всего для овладения верденского укрепленного района германцы бросили в бой почти один миллион своих солдат, от них Верден обороняли почти 500 тыс. французских бойцов.

***В начальный период наступления немцам сопутствовала удача, в первый же день наступления они применили газы, во второй - тогдашнюю новинку - девяносто шесть огнеметов. Страшное это было зрелище: вокруг все горело и взрывалось, гарнизоны французских крепостных фортов, германцы сжигали их при помощи огнеметов буквально заживо.***

***Накал сражения не снижался ни на минуту, поставляемые на фронт людские подкрепления гибли тысячами, сгорали, словно сухие дрова в печи, так к концу марта 1916 г. французы потеряли под Верденом уже почти 89 тысяч человек, а немцы порядка - 82 тысяч.***

Сквозь так называемую «верденскую мясорубку» прошли 70 французских и 50 германских дивизий, несмотря на огромное количество принимавших участие в операции войск, ее пространственный размах был весьма невелик, всего составлял до 30 км по фронту и до10 км в глубину, и на таком небольшом участке местности воевали свыше миллиона солдат.

Боевые действия под Верденом завершились без получения какой-либо из сторон господства на поле боя, хотя общее число жертв достигло почти 1 миллион человек, это было самое настоящее сражение на истощение сил обоих противников.



**Фотаздымак “Вердэнская мясарубка”**

**Краткое описание битвы под Верденом**

К началу 1916 года германское командование приняло свой новый план по разгрому армий союзников на Западном фронте, основная суть плана немцев состояла в том, чтобы прорвать так называемую верденскую дугу - оплот всего французского фронта, чтобы тем самым вызвать существенное стратегическое изменение в расстановке сил на всем Западном фронте и, выйдя непосредственно к Парижу, принудить руководство Франции к капитуляции.

Активные боевые действия под Верденом начались 21 февраля 1916 года, именно в этот день германская армия начала свое самое кровопролитное сражение из всех сражений, в которых участвовала Германия за всю историю своего существования. 946 орудий, из которых почти 500 тяжелых, открыли массированный огонь по французским позициям. Участок, предназначенный для прорыва фронта, составлял всего-то не более 12 километров, десять часов, без остановки и перерывов, германцы долбили своей тяжелой артиллерией. Всего для овладения верденским укрепленным районом германцы бросили в бой почти один миллион своих солдат, от них Верден обороняли почти 500 тыс. французских бойцов.

***В начальный период наступления немцам сопутствовала удача, в первый же день наступления они применили газы, во второй – тогдашнюю новинку – девяносто шесть огнеметов. Страшное это было зрелище: вокруг все горело и взрывалось, гарнизоны французских крепостных фортов германцы сжигали при помощи огнеметов буквально заживо.***

***Накал сражения не снижался ни на минуту, поставляемые на фронт людские подкрепления гибли тысячами, сгорали, словно сухие дрова в печи. Так, к концу марта 1916 г. французы потеряли под Верденом уже почти 89 тысяч человек, а немцы порядка – 82 тысяч.***

Сквозь так называемую «верденскую мясорубку» прошли 70 французских и 50 германских дивизий, несмотря на огромное количество принимавших участие в операции войск, ее пространственный размах был весьма невелик, всего составлял до 30 км по фронту и до10 км в глубину. И на таком небольшом участке местности воевали свыше миллиона солдат.

Боевые действия под Верденом завершились без получения какой-либо из сторон

господства на поле боя, хотя общее число жертв достигло почти 1 миллиона человек. Это было сражение на истощение сил обоих противников.